# МІФАПАЭТЫЧНЫЯ МАТЫВЫ І ВОБРАЗЫ Ў ТВОРЧАСЦІ В. ЗУЁНКА

**Р. А. Бібік**
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца міфапаэтычныя матывы і вобразы ў творчасці В. Зуёнка. Асаблівая ўвага звяртаецца на вобраз агню.

**Ключавыя словы:** В. Зуёнак; міфапаэтычныя матывы; міфапаэтычныя вобразы; агонь.

Творчасць В. Зуёнка, яркай постаці сучаснай беларускай літаратуры, пастаянна прыцягвае ўвагу чытачоў і даследчыкаў. Гэта абумоўлена шматграннасцю таленту паэта, набытак якога ўбірае ў сябе і дасягненні сучаснасці, і каштоўнасці сусветнай культуры, і духоўна-эстэтычны вопыт народа.

Міфалагічная і фальклорная спадчына стала крыніцай узнікнення запамінальных мастацкіх вобразаў у творчасці В. Зуёнка. Шырокую прадстаўнічасць у ёй займелі матывы і вобразы, што сілкуюцца менавіта з усходнеславянскай міфалогіі. Селянін па паходжанні, паэт яшчэ ў дзяцінстве спасціг і пераняў ад даўніх продкаў рэшткі паганскага светасузірання, што і па сёння захаваліся ў народзе:

*Мачулішча...*
*Відаць, і пры Ярыле*
*Ільны ў нас сеялі,*
*Вымочвалі ў Мачыле.*
*Бель-кужаль пралі, ткалі, вышывалі,*
*Кашулі ў кайстры*
*Напамінкам клалі* [1, с. 28].
(“Успамін”)

В. Зуёнак заўсёды захапляўся творчасцю М. Багдановіча, у прыватнасці, яго паэтычным цыклам “У зачараваным царстве”, дзе пачынальнік беларускай літаратуры стварыў этнаграфічны воблік роднага краю, населенага міфалагічнымі істотамі – лесуном, вадзяніком, русалкамі. Сучасны паэт, як і яго слынны папярэднік, адлюстроўвае старажытнае светабачанне ва ўласнай творчасці, як, напрыклад, у вершы “Балотнік”: “*Дзе б мяне ні насіў мой лёс: / Ці на моры, ці ў пыльнай пустыні, / Ці на горы нябесныя ўзнёс, – / Гэты водар мяне не пакіне. / Водар траў, імхоў, багуну / Мне дзікунскія ноздры вярэдзіць. / Там ён, там, хто мой свет паглынуў, – / Бог балотны – хаваецца недзе… / <…> / Мне і сёння стажар’я сяннік / Лугавінай шуміць пад шчакою. / Дзе багністы зыбун плыве, / Я іду першабытным зверам. / <…> / Нас не будзе, ды будзе час, /*

*І прышэльцы з далёкай планеты / У маіх балотных вачах / Прачытаюць паданні Сусвету*” [1, 79–80].

Ключавымі вобразамі ў творах В. Зуёнка з’яўляюцца тыя, якія абазначаюць найважнейшыя складнікі народнага быцця, знакавыя з часоў язычніцтва рэчы і з’явы: ралля, плуг, баразна, поле, камень, парог, жаўрук і інш.

З прыродных стыхій, што шанаваліся продкамі, паэта найбольш прываблівае агонь, адзін з самых распаўсюджаных і “моцных” міфапаэтычных сімвалаў ва ўсім свеце. Са старажытных часоў у мастацкай літаратуры вобраз агню выконваў важную ролю, спрыяючы выражэнню аўтарскай пазіцыі і пафасу твора.

У літаратурных тэкстах міфалагема “агонь”, як правіла, вызначаецца амбівалентнасцю. Як сімвалічнаму мастацкаму вобразу ёй уласцівы метафарычнасць і іншасказальнасць, асацыятыўнасць і парадаксальнасць. Агонь выконвае розныя эстэтычныя функцыі і выступае ачышчальнай, гаючай або разбуральнай, гібельнай стыхіяй: “*Калі ён загараецца аднойчы – / Агонь начлежны ці агонь купальны, / Агонь ахоўны ці агонь знішчальны, / Агонь сігнальны ці агонь мяцежны, / Агонь духоўны ці агонь пасмешны, / Агонь суцешны ці агонь грахоўны, / Агонь прывальны ці агонь бунтоўны, / Агонь акрутны ці агонь аслабны, / Агонь прывабны ці агонь пакутны, / Агонь прыблудны ці агонь прабудны, / Агонь бадзяжы ці агонь ахвярны, – / Агонь раскажа, не пагасне марна. / Агонь не згіне, пройдзе праз вякі!*” [2].

В. Зуёнак раскрыў неадназначную прыроду агню ў шматлікіх натурфіласофскіх вершах, а таксама ў ліра-эпічнай трылогіі “Агонь і сонца”. З вобразам агню звязаныя міфалагічныя персанажы адной з яе частак, паэмы “Лукам’е” – Жыжаль, Зніч, Пярун.

Значнае месца ў мастацка-вобразным свеце В. Зуёнка займаюць ідэалы народнай эстэтыкі. Так, у вершы “Жаўранкі. Амаль балада” выведзены вобраз прадзеда Данілы, які пры ворыве ашчадна абыходзіць жаўруковыя гнёзды, кажучы: “*Не пад’ясі ніколі, – / А песня во для ўсіх над цэлым полем!*” [1, с. 52]. Падобную філасофію прапаведуе лірычны герой верша “Я трыццаць год на асфальце...”, тоесны самому аўтару: літаратурную дзейнасць ён параўноўвае з працай селяніна, для каго, як для Данілы, таксама надзвычай каштоўныя плуг, баразна, жаўрукова гняздо:

*Я трыццаць год на асфальце,*
*А ўсё яшчэ цяжка хаджу –*
*Сутулены,*
*Нібы за плугам,*
*Над баразною –*
*Плечы да сонца.*
*Іду і ўглядаюся долу,*

*Каб не наступіць*
*На краску*
*Ці на жаўрукова гняздо* [2].

Персанажамі многіх твораў з’яўляюцца птушкі, вобразы якіх апаэтызаваны ў беларускім фальклоры: драчы, кнігаўкі, жаўранкі, гракі, зязюлі, буслы, перапёлкі і інш. Лірычны герой верша “Без жаўранка...” нават марыць ператварыцца ў птушку пасля смерці: “*...Памру – сюды хоць аднойчы / Жаўранкам прылячу*” [1, с. 63].

Такім чынам, у творчасці В. Зуёнка шырока прадстаўлены міфапаэтычныя матывы і вобразы, якія выяўляюць спецыфіку аўтарскага светасузірання. Пры іх дапамозе ствараецца своеасаблівы мастацкі свет паэзіі гэтага пісьменніка.

**Літаратура**


1. Зуёнак, В. Выбраныя творы / В. Зуёнак ; уклад., камент. аўтара ; прадм. Н. Заяц. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 512 с.
2. Зуёнак, В. Жніўны дзень : выбранае [Электронны рэсурс] / В. Зуёнак ; прадм. Р. Барадуліна. – Мінск : Маст. літ. – 351 с. // Kamunikat : Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/usie_knihi.html?lang=EN&pubid=19499. – Дата доступу: 01.04.2020.